## *ГІСТОРЫЯ*

*УДК 94(476)«1861–1904»*

*А. П. ЖЫТКО, С. А. ТАЛМАЧОВА*

# ПАЛІТЫКА САМАДЗЯРЖАЎЯ Ў АДНОСІНАХ ДА ІНСТЫТУТА МІРАВЫХ ПАСРЭДНІКАЎ У БЕЛАРУСІ (1861–1904 гг.)

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка*

*(Паступіў у рэдакцыю 09.10.2012)*

Праблеме ролі і месца інстытута міравых пасрэднікаў у расійскай і беларускай гістарыяграфіі не надавалася належнай увагі. Нават класікі аграрнай гісторыі Беларусі XIX ст., такія як М. Фрыдман, С. Самбук, В. Панюціч і інш., у сваіх працах прысвяцілі міравым пасрэднікам толькі некалькі абзацаў. У апошнія гады ў рамках выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава» былі апублікаваны невялікія матэрыялы С. Талмачовай і А. Саскавец па дадзенаму пытанню. Аўтары артыкулаў паспрабавалі акумуліраваць надрукаваныя напрацоўкі з прыцягненнем раней невядомых заканадаўчых актаў і інфармацыі архіўных крыніц.

60-я гг. XIX ст. у гісторыі Расіі – час карэннай перабудовы сацыяльна-эканамічных адносін. Старая сістэма гаспадарання, якая была заснавана на паднявольнай працы і панаванні пазарыначных механізмаў, аджыла свой час. Змены праводзіліся «зверху» і пачаліся са скасавання прыгону.

Характар пераўтварэнняў шмат у чым залежаў ад механізма правядзення рэформы 1861 г. Справа ў тым, што ў тагачаснай Расіі шматлікія пачынанні заканчваліся правалам і не дасягалі сваёй мэты. Адзін з аўтараў Рэдакцыйных камісій М. А. Мілюцін заяўляў: «Увесь поспех вялікай справы будзе залежаць ад таго, як яна будзе выконвацца. Любое выкананне можа сказіць і пераўтварыць у мёртвую літару лепшыя намеры заканадаўцы» [1, с. 346]. Для практычнай рэалізацыі рэформы была створана спецыяльная ўстанова на месцах – інстытут міравых пасрэднікаў [2, с. 56].

Пасрэднікі валодалі вялікім колам паўнамоцтваў як у адміністрацыйных, так і судова-натарыяльных справах. Асноўным іх абавязкам было рэгуляванне пазямельных адносін паміж сялянамі і памешчыкамі: увядзенне, а ў некаторых выпадках і складанне ўстаўных грамат, развярстанне ўгоддзяў, павышэнне ці паніжэнне павіннасцей, увядзенне выкупных актаў, спагнанне нядоімак і г. д., а таксама зацвярджэнне на пасадах асоб сялянскага самакіравання.

Да судовых спраў адносіўся разбор спрэчак, непаразуменняў і скаргаў на памешчыка, асобных сялян і органы сялянскага грамадскага самакіравання. Натарыяльныя справы ўключалі засведчанне розных актаў, якія заключаліся паміж памешчыкамі і часоваабавязанымі сялянамі.

Пасрэднікам было даручана выкананне некаторых судова-паліцэйскіх функцый: аб патравах, парубках лесу і г. д. З распаўсюджаннем на тэрыторыю Беларусі судовай рэформы 1864 г. судовыя функцыі з 1872 г. перадаваліся міравому суду.

Прэстыжу пасады пасрэдніка ў значнай ступені садзейнічалі яго незмяняемасць, незалежнасць, шырокая ступень самастойнасці, галоснасць дзейнасці. Пасрэднік не мог быць зняты з пасады адміністрацыйным шляхам. Ён не быў прама і непасрэдна падначалены нават міравому з’езду і губернскай адміністрацыі. У сакавіку 1861 г. МУС дало тлумачэнні губернатарам: «Дзеянні пасрэднікаў падлягаюць у пэўных выпадках перагляду па рашэнню губернскіх прысутнасцяў, але падпарадкавання тут няма» [3, л. 4].

Дзейнасць пасрэднікаў не была бязвыплатнай, у адрозненне ад прадвадзіцеляў дваранства. Яны атрымлівалі 1500 руб. жалавання на год. Справаздачы аб выдатках з гэтай сумы не патрабавалася. Але не аклады заахвочвалі пасрэднікаў першага трохгадовага склікання. Яны былі даволі забяспечанымі асобамі, таму што гэтую пасаду мог заняць толькі мясцовы патомны дваранін, які валодаў зямельнай маёмасцю не менш 500 дзес. Неабходна зазначыць, што першы склад міравых пасрэднікаў у асноўным прытрымліваўся ліберальных пазіцый. Гэта нярэдка прыводзіла да канфліктаў паміж пасрэднікамі і памешчыкамі ў вырашэнні спраў. Напрыклад, у 1862 г. два пасрэднікі Быхаўскага павета Магілёўскай губ. вымушаны былі прасіць аб адстаўцы з-за абструкцыі з боку мясцовых дваран [4].

На тэрыторыі Беларусі на пачатку сваёй дзейнасці абсалютную большасць пасрэднікаў складалі мясцовыя дваране рымска-каталіцкага веравызнання. З пачатку 1861 г. пачаліся хваляванні ў Царстве Польскім. Міравыя пасрэднікі беларускіх паветаў аказаліся ў апазіцыі да ўрадавай палітыкі. Пасада пасрэдніка ў краі была зручнай для канспіратыўнай дзейнасці і арганізацыі паўстання. Нягледзячы на тое, што ў Паўночна-Заходнім краі з 1861 г. было абвешчана ваеннае становішча, пасрэднікі мелі магчымасць наведваць усе паселішчы свайго ўчастка і праводзіць агітацыйную работу сярод памешчыкаў і сялян. На пачатку 1863 г. падтрымка пасрэднікамі нацыянальна-вызваленчага руху стала відавочнай. У выніку 7 сакавіка 1863 г. Аляксандр II даў дазвол Віленскаму генерал-губернатару звальняць з пасады міравых пасрэднікаў, валасных старшынь і сельскіх старастаў, «якіх пры сучасных надзвычайных абставінах прызнаюць недастаткова добранадзейнымі» [5, № 39354].

Паводле ўказа ад 18 красавіка 1863 г. у сувязі з выхадам у адстаўку 28 асоб Гродзенскай губ., якія займалі пасады павятовых прадвадзіцеляў дваранства, павятовых суддзяў і міравых пасрэднікаў, гэтыя пасады былі замешчаны чыноўнікамі па прызначэнні ўрада [6, с. 204]. 24 сакавіка 1863 г. Віленскі генерал-губернатар В. Назімаў у сваёй запісцы на імя Міністра ўнутраных спраў пісаў, што ў сувязі з адстаўкай Гродзенскага губернскага прадвазіцеля дваранства графа Старжынскага, а за ім і міравых пасрэднікаў, ёсць падстава лічыць, што «такога роду дэманстрацыі з боку мясцовага дваранства маглі быць дапушчальны для ўрада, якому неабходна выкарыстаць гэты выпадак на сваю карысць, каб раз і назаўжды вызваліцца ад польскага дваранскага ўплыву, якое прысвоіла сабе права на замяшчэнне ўрадавых пасад членамі свайго саслоўя» [6, с. 214; 7, с. 336].

22 мая 1863 г. Віленскі генерал-губернатар адзначаў у справаздачы Міністру ўнутраных спраў, што многія міравыя пасрэднікі самі прымалі ўдзел у паўстанні, «карысталіся сваім уплывам на сялян» для прыцягнення на свой бок. У сувязі з гэтым Віленскі генерал-губернатар загадаў у Віленскай і Гродзенскай губернях звольніць з пасад усіх міравых пасрэднікаў і кандыдатаў на іх, закрыць міравыя з'езды. Такія ж меры распаўсюджваліся і на Мінскую губерню, за выключэннем тых мясцовасцей, дзе губернатар «прызнае магчымым захаваць міравыя ўстановы», а на пасады міравых пасрэднікаў былі прызначаны «як часовая мера, чыноўнікі ад урада, па выбару губернатара». У Віцебскай і Магілёўскай губернях прапанавалася звольніць з пасад і замяніць урадавымі чыноўнікамі толькі «нядобранадзейных» міравых пасрэднікаў. Пры гэтым арганізоўвалася рассылка аб'яў па валасцях аб спыненні дзеянняў міравых устаноў, аб звальненні ад пасад міравых пасрэднікаў, каб паведаміць сялянам, што «ўлада міравых пасрэднікаў над імі спыняецца» [8, л. 3–3 адв.].

Добраахвотная адстаўка міравых пасрэднікаў паскорыла пытанне аб поўнай іх замене ва ўсім краі ўрадавымі чыноўнікамі. Па прадстаўленні Заходняга камітэта ў адпаведнасці з указам ад 27 мая 1864 г. усе службовыя месцы ў краі, а таксама і іх начальнікі, якія мелі непасрэднае дачыненне да народа, павінны былі быць заменены выключна асобамі рускага паходжання праваслаўнага веравызнання [6, с. 204]. У выніку, напрыклад, у беларускіх паветах Віленскай губ. у 1869 г. усе міравыя пасрэднікі былі праваслаўнага веравызнання, а пасады займалі, пачынаючы з 1863 г. ці пазней. Пры гэтым 9 з 16 міравых пасрэднікаў былі ўзнагароджаны медалём «у гонар уціхамірання польскага мецяжу 1863–1864 гг.» [9, с. 159–160, 170–171, 176, 182–183].

Новых міравых пасрэднікаў пачалі набіраць са складу сваіх служачых тры міністэрствы: унутраных спраў, дзяржаўнай маёмасці і юстыцыі. Звычайна гэтых чыноўнікаў, якія не валодалі зямельнай уласнасцю ў краі і не мелі сваякоў сярод мясцовых памешчыкаў, запрашалі з унутраных губерняў Расіі [6, с. 214; 5, № 40366; 10, № 41066]. У сувязі з тым, што іх абсалютная боль-

шасць не мела іншага даходу, акрамя жалавання, ім павялічылі надбаўку да яго на 50% [6, с. 214; 5, № 39935]. Урад спадзяваўся не толькі палепшыць іх матэрыяльнае становішча і заахвоціць службай у краі, але і зрабіць іх матэрыяльна незалежнымі ад мясцовых памешчыкаў. У прыватнасці, у 1865 г. у беларускіх паветах Віцебскай губ. толькі два пасрэднікі атрымоўвалі гадавое жалаванне ў 1500 руб., астатнія – па 2000 ці 2500 руб. Гэта азначае, што толькі гэтыя два былі з мясцовых дваран [11, с. 15–17]. Акрамя гэтага, на ўсіх чыноўнікаў, якія накіроўваліся на службу ў заходнія губерні, распаўсюджваліся правілы, па якіх яны прыраўноўваліся да служачых аддаленых губерняў Расіі. Тэрмін абавязковай службы на месцы быў скарочаны з трох да двух гадоў. Гэтыя льготы садзейнічалі шырокаму наплыву чыноўнікаў з унутраных губерняў імперыі. Папячыцель Віленскай вучэбнай акругі ў 1864 г. вымушаны быў прызнаць, што на заклік М. Мураўёва разам з дзясяткамі чэсных і дзелавітых людзей у краі з'явілася і мноства «галодных, якія шукалі крыніцы нажывы, асоб» [6, с. 214–215].

Апеляцыйнай інстанцыяй на рашэнні міравых пасрэднікаў сталі з'езды міравых пасрэднікаў, якія ствараліся ў адпаведнасці з «Палажэннем аб губернскіх і павятовых па сялянскіх справах установах» ад 19 лютага 1861 г. [12, № 36660]. Міравыя з'езды збіраліся з міравых пасрэднікаў павета і прадстаўніка ад урада. Старшынёй з'езда з'яўляўся павятовы прадвадзіцель дваранства. У якасці члена ад урада ў павятовым міравым з'ездзе прысутнічаў адзін з спецыяльна прызначаных для гэтага чыноўнікаў. Пры прызначэнні членаў ад урада ў склад міравых з'ездаў улада імкнулася садзейнічаць дакладнаму выкананню выдадзеных пастаноў па сялянскай справе.

Да ведамства міравых з'ездаў адносіўся разгляд і ліквідацыя цяжкасцей пры складанні і зацвярджэнні ўстаўных грамат, іх выпраўленне пасля паверачнага вымярэння сялянскіх зямельных надзелаў, разгляд скаргаў на рашэнні міравых пасрэднікаў. Акрамя таго, у кампетэнцыю міравых з'ездаў уваходзіў набор вольнанаёмных каморнікаў, калі не хапала казённых, усталяванне тэрміну плацяжоў аброку для маёнткаў, дзе памешчык і сяляне не прыйшлі да дабрачыннага пагаднення і інш.

Справы ў міравым з'ездзе разглядаліся па прадстаўленнях міравых пасрэднікаў, патрабаваннях губернскай па сялянскіх справах установы і губернатара, просьбах і скаргах памешчыкаў, сялян і іншых асоб. Пасяджэнні праводзіліся адзін раз у месяц, а пры адсутнасці тэрміновых спраў – раз у 2 месяцы. Тэрмін пасяджэнняў усталёўваўся ў пачатку года па ўзгадненні з губернскай па сялянскіх справах установай.

Рашэнні павятовага міравога з'езда запісваліся ў асобную кнігу, падпісваліся прысутнымі, абвяшчаліся на з'ездзе ў прысутнасці істца і адказчыка пад распіску і прымаліся для выканання ці міравым пасрэднікам, ці чынамі земскай паліцыі. Скаргі на рашэнні падаваліся ў губернскую па сялянскіх справах устнову [13, с. 132–133].

Паводле ўказа 1 сакавіка 1863 г. у Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай і Мінскай губернях часоваабавязаны стан сялян скасоўваўся, і ўсе яны пераводзіліся на абавязковы выкуп [5, № 39357].

Для рэалізацыі гэтага ўказа ствараліся паверачныя камісіі, на якія ўскладалася праверка правамернасці ўжо складзеных устаўных грамат і перавод іх у выкупныя акты. 9 красавіка 1863 г. былі зацверджаны правілы аб складзе і парадку дзеянняў камісіі. На кожны павет прыпадала адна камісія ў складзе члена ад МУС (ён жа і старшыня), чыноўніка ад Міністэрства фінансаў і міравога пасрэдніка таго ўчастка, дзе працавала камісія [5, № 39463]. З 1864 г. старшынёй з'езда міравых пасрэднікаў становіўся не павятовы прадвадзіцель дваранства, а адзін з чыноўнікаў паверачнай камісіі [14, л. 4]. На падставе зацверджанага імператарам палажэння Галоўнага камітэта аб уладкаванні сельскага стану Віленскаму генерал-губернатару дазвалялася павялічыць колькасць камісій у кожным павеце да дзвюх [5, № 40145]. Але, як сведчаць афіцыйныя даныя за 1864 г., у беларускіх паветах Віленскай губ. дзейнічалі па адной камісіі. Іх члены былі прызначаны ў 1863 г., і ўсе яны, за выключэннем старшыні камісіі Лідскага павета, былі праваслаўнага веравызнання [15, с. 151–163].

Паводле закона ад 19 красавіка 1866 г., паверачныя камісіі скасоўваліся ў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях і інфляндскіх паветах Віцебскай губ. [16, № 43212]. Па прапанове Віленскага генерал-губернатара фон Каўфмана старшынямі міравых з'ездаў, як і раней з 1864 г., станавіліся не павятовыя прадвадзіцелі дваранства, а чыноўнікі ад урада, звычайна адзін з чле-

наў былых паверачных камісій. Пры гэтым старшыня зацвярджаўся не Сенатам, а міністрам унутраных спраў [16, № 43636].

Такая сітуацыя захавалася толькі адзін год. Па ініцыятыве новага Віленскага генерал-губернатара Баранава ўрад у 1867 г. вярнуўся да агульнарасійскай практыкі прызначэння прадвадзіцеляў дваранства на пасады старшынь з'ездаў міравых пасрэднікаў [14, л. 7]. Пры гэтым адначасова вырашалася праблема запаўнення вакансій павятовых прадвадзіцеляў дваранства выхадцамі з рускіх губерняў. Пасада прадвадзіцеля дваранства была ганаровай і бясплатнай, таму жадаючых ехаць у губерні Паўночна-Заходняга краю было мала, сумяшчэнне ж пасады прадвадзіцеля і старшыні з'езда дазволіла аплочваць пасаду прадвадзіцеля дваранства. Першапачаткова жалаванне складала 2500 руб., а з 1 студзеня 1875 г. яно было павялічана на 500 руб. [17, № 54253]. Акрамя таго, тыя старшыні, якія даслужыліся да пенсіі на папярэдняй службе, захоўвалі яе памер разам з акладам на новай пасадзе [18, № 56838].

Такім чынам, у параўнанні з унутрырасійскімі губернямі, павятовыя прадвадзіцелі дваранства ў Заходнім краі не выбіраліся на дваранскіх з'ездах (з 1862 г.), а прызначаліся ўрадам. Іх пасада з 1867 г. станавілася платнай, у выніку чаго прадвадзіцель-старшыня пераўтвараўся ў звычайнага чыноўніка і ў той жа час станавіўся вышэйшай адміністрацыйнай асобай у павеце. Справа ў тым, што па закону інстытут павятовых прадвадзіцеляў дваранства з'яўляўся адным з важнейшых органаў у дваранскай саслоўнай арганізацыі і ў сістэме мясцовага кіравання. Кола абавязкаў прадвадзіцеляў было вельмі шырокім і разнастайным. Адзін пералік камісій і камітэтаў, у якіх яны з'яўляліся старшынямі ці членамі, сведчыць аб дачыненні іх амаль што да ўсіх сфер мясцовага кіравання і гаспадаркі [19, арт. 294, 295]. Калі губернскі прадвадзіцель усёж-такі часткова засланяўся губернскай уладай, то павятовы быў сапраўды гаспадаром павета. Ён фактычна замяняў павятовае звяно ў мясцовым бюракратычным апараце.

Нягледзячы на вышэйназваныя захады ўрада, у краі ўсё роўна заставаліся вакансіі прадвадзіцеляў-старшынь. Таму ў 1868 г. у адказ на хадайніцтва Віленскага генерал-губернатара Патапава было дазволена ў крайніх выпадках замяшчаць названыя пасады асобамі «польскага» паходжання. У выніку каля паловы пасад былі замешчаны мясцовымі дваранамі рымска-каталіцкага веравызнання [20, л. 68].

Такое становішча непакоіла ўрад, які лічыў, што мясцовыя дваране, за рэдкім выключэннем, былі «маланадзейнымі праваднікамі ўрадавых ініцыятыў, накіраваных на трывалае зліццё паўночна-заходняй ускраіны з імперыяй» [20, л. 68]. Таму Віленскі генерал-губернатар Каханаў у 1884 г. у запісцы на імя цара выказаў думку аб неадпаведнасці прызначэння прадвадзіцеляў дваранства «з палякаў» для дасягнення ўрадавых мэт у Паўночна-Заходнім краі і аб неабходнасці прыняцця такіх мер, якія б далі магчымасць замяшчаць пры зручным выпадку пасады прадвадзіцеляў дваранства, а значыць, і старшынь міравых з'ездаў асобамі рускага паходжання [14, л. 68 зв.].

Аднак вырашэнне гэтай праблемы ўскладнялася тым, што па меры завяршэння спраў па рэалізацыі рэформы 1861 г. паступова скарачалася колькасць міравых участкаў, а ў застаўшыхся павялічвалася колькасць валасцей на кожны з іх. Так, у беларускіх паветах Віленскай губ. колькасць міравых участкаў зменшылася з 5–6 у 1862 г. да трох у 1873 г. [21; 22, с. 188–206].

Вынікам скарачэння колькасці міравых участкаў стала і аб'яднанне міравых з'ездаў некалькіх паветаў. Так, з 4 мая 1872 г. былі аб'яднаны Віленскі і Трокскі з'езды міравых пасрэднікаў [23, № 50803]. 23 кастрычніка 1873 г. – утвораны 5 аб'яднаных з'ездаў замест 11 павятовых у Магілёўскай губ. (Чэрыкаўска-Клімавіцка-Мсціслаўскі, Горыцка-Чавусаўскі, Аршанска-Сенненскі, Магілёўска-Быхаўскі, Рагачоўска-Гомельскі) [20, л. 74–75]. У Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях інстытут міравых пасрэднікаў быў ліквідаваны на падставе зацверджанага меркавання Дзяржаўнага савета ад 4 красавіка 1878 г. Замест яго былі створаны павятовыя па сялянскіх справах установы [24, № 58352]. Аднак у Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях інстытут міравых пасрэднікаў захаваўся да 1904 г. Пры гэтым тут адбываўся далейшы працэс скарачэння колькасці міравых участкаў і ўтварэння аб'яднаных з'ездаў. У 1882 г. у Віленскай губ. іх было 3: Віленска-Трокскі, Вілейска-Ашмянскі і Дзісненска-Свянцянскі, а у Гродзенскай – 4: Гродзенска-Ваўкавыскі, Брэсцка-Бельскі, Кобрынска-Пружанскі і Беластоцка-Сакольскі [20, л. 74–75]. У выніку

прадвадзіцелі дваранства Трокскага, Ашмянскага, Свянцянскага, Ваўкавыскага, Бельскага, Пружанскага і Сакольскага паветаў не маглі атрымліваць жалаванне.

Віленскі генерал-губернатар Каханаў у прадстаўленні міністру ўнутраных спраў 22 студзеня 1886 г. адзначаў, што «пры такіх умовах прыходзілася па неабходнасці ставіць на пасады павятовых прадвадзіцеляў дваранства асоб, якія не адпавядалі гэтаму прызначэнню, з мясцовых памешчыкаў. Такім чынам, аказалася, што для замяшчэння вакансій на гэтую пасаду не было нікога з жыўшых у краі рускіх…» [20, л. 15–16].

Менавіта для таго, каб матэрыяльна заахвоціць кандыдатаў з ліку рускіх землеўладальнікаў, Каханаў у 1884–1886 гг. неаднаразова ўздымаў перад Міністэрствам унутраных спраў пытанне аб аднаўленні ў Паўночна-Заходнім краі асобных з'ездаў міравых пасрэднікаў у кожным павеце, а пасаду старшыні міравога з'езда, які атрымоўваў жалаванне, аб'яднаць з пасадай павятовага прадвадзіцеля дваранства. Гэта была палітычная праблема, вырашэнне якой садзейнічала б паспяховай рэалізацыі палітыкі русіфікацыі края. Сваю пазіцыю Каханаў падмацоўваў і сацыяльна-эканамічнымі аргументамі. Ён сцвярджаў, што «аднаўленне самастойных з'ездаў [міравых пасрэднікаў] у кожным павеце паскорыць у даручаным яму краі заканчэнне сялянскіх спраў, а таксама спраў аб вольных людзях і чыншавіках» [20, л. 69].

Пасля неаднаразовых абмеркаванняў названага пытання ў Камітэце міністраў, Дзяржаўным савеце ў аб'яднаных Дэпартаментах законаў і Дзяржаўнай эканоміі, 30 мая 1888 г. Аляксандр III зацвердзіў меркаванне Дзяржаўнага савета аб аднаўленні самастойных павятовых з'ездаў міравых пасрэднікаў у Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губернях [20, л. 80–84]. У выніку ўсе павятовыя прадвадзіцелі дваранства рымска-каталіцкага веравызнання былі заменены праваслаўнымі. Такая сітуацыя захавалася да 1904 г., калі на ўказаныя губерні быў распаўсюджаны закон ад 12 ліпеня 1889 г., па якому інстытут міравых пасрэднікаў скасоўваўся, а функцыі пасрэднікаў былі перададзены земскім начальнікам. Пры гэтым пасады старшынь павятовых з'ездаў земскіх начальнікаў займалі прадвадзіцелі дваранства з акладам у 2500 руб. [25, № 23106].

Такім чынам, калі падвесці вынікі палітыкі самадзяржаўя ў Беларусі ў адносінах да інстытута міравых пасрэднікаў, то можна заўважыць яе асаблівасці, якія заключаліся ў наступным:

1) першапачаткова інстытут міравых пасрэднікаў у краі фарміраваўся на тых жа падставах, што і ў імперыі ў цэлым;

2) пачынаючы з 1863 г., міравыя пасрэднікі ў Беларусі прызначаліся не Сенатам, а Віленскім генерал-губернатарам, звычайна не з мясцовых дваран, якія падпадалі пад юрысдыкцыю генерал-губернатара і губернатараў і залежалі ад іх;

3) з 1864 па 1867 г. старшынямі павятовых з'ездаў міравых пасрэднікаў прызначаліся не прадвадзіцелі дваранства, а члены ад урада павятовых паверачных камісій;

4) з 1863 па 1866 г. дзейнічалі паверачныя камісіі па перагляду раней заключаных устаўных грамат і ўвядзенні ў дзеянне выкупных актаў;

5) з 1867 г. пасада старшыні павятовага з'езда была аб'яднана з пасадай прадвадзіцеля дваранства ў адпаведнасці з Палажэннямі ад 19 лютага 1861 г., але яна насіла платны характар. Тым самым прадвадзіцель дваранства станавіўся чыноўнікам;

6) у Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях інстытут міравых пасрэднікаў быў ліквідаваны ў 1878 г., а не ў 1876 г., як ва ўнутраных губернях Расіі, а ў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях – толькі ў 1904 г.;

7) у рускіх губернях з 1864 г. адбывалася скарачэнне колькасці міравых участкаў і, адпаведна, міравых пасрэднікаў. У Беларусі да 1872 г. захавалася першапачатковая колькасць участкаў. Гэта было выклікана тым, што ў беларускіх губернях з 1863 г. усе сяляне пераводзіліся на абавязковы выкуп, што патрабавала складвання і зацвярджэння выкупных актаў. Акрамя гэтага, у Беларусі налічвалася значная колькасць такіх катэгорый сялянскага насельніцтва, як панцырныя баяры, праваслаўныя арандатары, вольныя людзі, каланісты, чыншавікі і г. д., якіх не існавала ва ўнутраных губернях Расіі. Таму патрабавалася ўладкаванне гэтых груп сельскіх абывацеляў. У рускіх губернях судовая рэформа пачалася ў 1864 г., а ў беларускіх – з 1872 г., у выніку чаго судовыя функцыі міравых пасрэднікаў перадаваліся міравым судам;

8) усе гэтыя захады ўрада былі скіраваны на рэалізацыю палітыкі русіфікацыі і ў пэўнай ступені інтэграцыі Беларусі ў склад Расійскай імперыі, якія насілі дваісты і пры гэтым хвалепадобны характар, што ўрэшце не прывяло да жадаемых вынікаў.

## Літаратура


1. Освобождение крестьян в царствование императора Александра II. – Т. 3. – Ч. 1: Хроника деятельности комиссий по крестьянскому делу Н. П. Семенова. – СПб., 1891.
2. Журналы и мемории Общего собрания Государственного Совета по крестьянскому делу с 28 января по 14 марта 1861 г. – Пг., 1915.
3. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу (РДГА). – Фонд 1291. – Воп. 123. – Спр. 22.
4. Могилевские губернские ведомости. – 1862. – 18 апреля.
5. Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). – Собр. 2-е: в 55 т. – СПб., 1830–1884. – Т. 38. – СПб., 1866.
6. *Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг.: манаграфія / А. П. Жытко. – Мінск: БДПУ, 2003.
7. Архивные материалы Муравьевского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863–1864 гг. в пределах Северо-Западного края // Виленский временник. – Вильна, 1913. – Кн. VI.
8. Дело о мировых посредниках Западных губерний // РГИА. – Фонд 1291. – Воп. 36. – 1863 г. – Спр. 33.
9. Памятная книжка Виленской губернии на 1869 год. – Вильна: Тип. Губернского правления, 1869.
10. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 39. – СПб., 1867.
11. Памятная книжка Витебской губернии на 1865 год / Изд. Витебским губернским статистическим комитетом / под ред. А. М. Сементовского. – СПб.: Тип. К. Вульфа, 1865. – VIII, 376, 128, 7 с. – Ч. 2: Отдел справочный.
12. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 36. – СПб., 1863.
13. Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917) / Т. Е. Леонтьева [и др.]; сост. Т. Е. Леонтьева, Д. Л. Яцкевич; редкол.: А. К. Голубович (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелНИИДАД, 2009.
14. О назначении уездных предводителей дворянства в Северо-Западном крае из местных дворян непольского происхождения с возложением на них обязанностей председателей мировых съездов // РДГА. – Фонд 1291. – Воп. 33. – 1867 г. – Спр. 7.
15. Памятная книжка Виленской губернии на 1864 год. – Вильно: Губернская типография, 1864.
16. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 41. – СПб., 1868.
17. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 50. – № 54253. – СПб., 1877.
18. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 52. – № 56838. – СПб., 1879.
19. Свод законов Российской империи. – СПб., 1876. – Т. 9: Законы о состояниях.
20. О восстановлении в Северо-Западном крае съездов мировых посредников // РДГА. – Фонд 1291. – Воп. 38. – 1885 г. – Спр. 20.
21. Памятная книжка Виленской губернии на 1862 год. – Вильно: Губернская типография, 1862.
22. Памятная книжка Виленской губернии на 1874 год. – Вильно: Губернская типография, 1873.
23. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 47. – № 50803. – СПб., 1875.
24. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 53. – № 58352. – СПб., 1880.
25. ПСЗРИ. – 3-е собр: в 33 т. – СПб., 1885–1916. – Т. 23. – № 23106. – СПб., 1905.



*A. P. ZHYTKO, S. A. TALMACHOVA*


**AUTOCRATIC POLICY IN RELATION TO INSTITUTION OF AMIABLE COMPOSITEURS IN BELARUS (1861–1904)**

## Summary


It is the first time the article has outlined policy of tsarist autocracy regarding the institution of amiable compositeurs in Belarus from 1861 to 1904. Authors of the article reveals peculiarities of policy in context of attempts to russianize the region of Belarus. Such attempts have been expressed in the following events:

– Senate did not appoint amiable compositeurs; they were appointed by the general-governor of Vilna;

– vast majority of amiable compositeurs did not belong to the local gentry, they came from inner Russian provinces.

During the 1864 – 1867 years leaders of local nobility have been never appointed on the post of the amiable compositeurs congress Chairmen. This position had been occupied by representatives of local authorities inspecting boards.

In 1867 the position of amiable compositeurs local congress Chairman has been combined with post of the leader of nobility who became a regular official. In provinces of Minsk, Vitebsk and Mogilev the amiable compositeurs establishment has been abolished. It was happened in 1878. Then in the general government of Vilna it has been abolished in 1904. To be compared, in inner Russian provinces liquidation of this institution has been held in 1876.